сятніка зварочавацца да лекарскай помачы (да хвэльчара). Ня малі права што–колечы купіць у крамах і наагул ніякага ня малі права. Яны малі права толькі паддавацца, хінуцца й баяцца. Сябры ҐПУ адбіралі ў іх усі дарагія рэчы, як гадзіньнікі, пярсьцёнкі і інш. Гвалцілі замужкі й дзяўчаты, асабліва гэтым адзначаліся заступнік начэльніка ҐПУ Шорохов, раённыя комэнданты Поляков і Бурачевскій ды мясцовы комэндант Костоломов.

На пасады дзясятнікаў, што былі беспасярэднімі начэльнікамі над адумысловымі перасяленцамі, прызначалі найагіднейшы элемэнт із мясцовых жыхараў. Дзясятнік або работнік із мясцовага жыхарства мог пабіць кажнага, адабраць у яго рэчы і наагул рабіць над ім усялякае ўсілства. З паміж дзясятнікаў асабліва нягоднымі былі Костя Леґотін і крымінальны выступнік Мазур.

Перасяленцы адказавалі на’т за коні, каторымі вывозілі сьсечанае дзерва зь лесу. Даволі было каню захварэць або закульгаць, хоць і бязь віны адумысловага перасяленца, яго вінаваціліў шкодніцтве і засуджавалі на 10 год концэнтрацыйнага табару. „Памятую, — казаў Кякала, — гэт’кіх двух засуджаных — Статкевіча й Бялінскага“.

Мясцовае жыхарства ставілася да адумысловых перасяленцаў нягодна, варожа.

# Патрэба навуковай працы

Спрадвеку сярод усіх больш–менш культурных народаў сьвету вядзецца навуковая праца. Без навукі сьвет застаўся–б пры сваім спачатным прымітыўным стане, і людзтва, размножыўшыся, не магло–б пражыць із тае еміны, што здабывала без навукі. Апрача таго, народы ня ведалі–б свае мінуласьці, каторая ё подам (падставаю) будучыні; ня ведалі–б яны таксама праўдзівага стану свае нацыянальнае грамады і ейных магчымасьцяў. Гэта наагул. Але ў дадзеную часіну, апрача ўсяго іншага, беларускаму народу патрэбна свая веда–навука дзеля вызваленьня яго. Беларуская навука — гэта адзін із найважнейшых, неабходных спосабаў здабыць незалежнасьць Беларусі, каб скончылася бязьмежнае гора нашага народу. Каб чужына, ад каторай залежа доля нашага народу, нам прыяла, трэба, каб яна нас знала, каб даведалася права беларускага народу на вольнае незалежнае жыцьцё. Пазнаёміць чужнікоў із праўдзівым станам беларускага народу, зь ягонай гісторыяй, сучаснасьцяй і будучымі магчымасьцьмі можа толькі беларуская навука. Яна гэта ясна пакажа й давядзець навукова прыведзенымі, пераконуючымі фактамі, арґумэнтамі, даводамі. Але ня толькі трэба навукова працаваць, трэба яшчэ друкам пашыраць здабытую праўду–веду; бяз гэтага мала хто зь яе скарыстае. А з надрукаванага можа карыстаць і чужнік і кажны Беларус, пашыраючы веданьне пра свой народ. На гэта выдаецца „Веда“. Праўда, толькі, колькі ў „Ведзе“ друкуецца, гэта як на лек хвораму. Але кажны прызнае, што тым болей гэта патрэбна. У „Ведзе“ ўсе працаўнікі працуюць дарма, аддаючы ёй вольны час ад работы на пражытак, і яны–ж найбалей матар’яльна памагаюць „Ведзе“. Друк 32 бачынаў „Веды“ і папера каштуюць 160 дал. З гэтага відаць, колькі трэба дакладаць яшчэ да тых ахвяраў і падпіскі, што ў „Ведзе“ квітуем. Каб „Веда“ магла існаваць, трэба каб ня толькі заставалася дагэтулешняя ахвярнасьць нашых людзёў на „Веду“, але каб ахвярнасьць павялічылася. Хай кажны прыяцель нашага народу сам споўніць сваю павіннасьць да „Веды“ і заахвоце да гэтага сваіх знаёмых, тады быцьцё „Веды“ ня толькі будзе забясьпечана, але й яна пабольшае.

# Адказ сп. Скуратовічу

Словаў „думніца“ й „дзюбаты“, ня толькі ў значаньню „галава“ й „гусь“, але і ў ніякім іншым значаньню ані ў „Ведзе“, ані ў іншым выданьню ніхто ня ўжываў і ня